# Ганарымся вамі, земляки!




Цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў абласной прэміі «Чалавек года Віцебшчыны-2023» адбылася ў мінулую пятніцу, 9 лютага, у Віцебску. Заслужанае званне і ўзнагароды атрымалі Анатоль Апанчонак і Яўген Ракіцкі.

*Працяг тэмы на старонцы 2.*

# Ганарымся вамі, землякі!

*Пачатак тэмы на старонцы 1.*

Уладальнікамі пачэснай узнагароды сталі 50 прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці з усіх куточкаў паўночнага рэгіёна. Гэта педагогі, работнікі культуры, працаўнікі аграпрамысловасці, ЖКГ, медыкі і іншыя заслужаныя людзі, якія ўнеслі важкі ўклад у развіццё Віцебшчыны.

Сярод лаўрэатаў – браслаўчане Яўген Ракіцкі, начальнік свінакомплексу СВК «Маяк Браслаўскі», і Анатоль Апанчонак, слесар па рамонце аўтамабіляў філіяла «Аўтатранспартнае прадпрыемства № 18 г. Браслава» ААТ «Віцебскаблтранс».

Да прысутных на цырымоніі звярнуўся старшыня аблвыканкама Аляксандр Субоцін. У сваім выступленні кіраўнік Віцебшчыны адзначыў, што вобласць завяршыла 2023 год са станоўчай дынамікай у асноўных галінах эканомікі. Валавы рэгіянальны прадукт павялічыўся на 3 % да ўзроўню 2022-га. На развіццё вытворчай і сацыяльнай сфер накіравана 3,2 млрд рублёў інвестыцый. У бягучым годзе вобласць захоўвае лідзіруючыя пазіцыі сярод рэгіёнаў рэспублікі па паказчыках экспарту (па экспарце тавараў займае першае месца, паслуг – трэцяе). Знешнегандлёвыя аперацыі ажыццяўляюцца са 115 краінамі. Знакавай падзеяй для вобласці стане праведзенне XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі пад дэвізам «Навука – будучыня Саюзнай дзяржавы». Разам з тым перад Віцебшчынай пастаўлены канкрэтныя задачы, для вырашэння якіх спатрэбяцца на кожным працоўным месцы і валоданне кампетэнцыямі, і ўменне прымаць узважанае рашэнне, і арганізатарская дысцыпліна. У фокусе ўвагі ўлады – якасць жыцця людзей.

«Дасягненні кожнага з вас – гэта поспех і ўсёй вобласці. Перакананы, толькі з адказным стаўленнем да працы можна здзяйсняць маштабныя прарывы, вырашаць смелыя задачы. Прыміце падзяку за добрасумленную, самаадданую працу, ініцыятыву і наватарства, адказную грамадзянскую пазіцыю. Няхай ваш прыклад служыць пуцяводнай зоркай для моладзі», – выказаў словы ўдзячнасці лепшым працаўнікам старшыня аблвыканкама.

Падтрымаць прадстаўнікоў Браслаўшчыны на ўрачыстасці адправілася дэлегацыя ў складзе старшыні райвыканкама Вячаслава Грышчанкі, яго намесніка Пятра Белуся і калег лаўрэатаў. «Прыемна і нечакана атрымаць такую ўзнагароду. Аднак немагчыма дабіцца высокіх паказчыкаў толькі аднаму. Гэта зладжаная работа ўсяго калектыву. Пасля такога хочацца працаваць яшчэ больш якасна і ставіць новыя планкі для дасягнення», – адзначыў Я. Ракіцкі пасля цырымоніі ўшанавання. ■

**Алена НАБЕЕВА.** *Фота аўтара.*